Указанная в настоящей проектной декларации цена за 1 м² считается действительной до момента опубликования новой декларации.

**Строительство жилых помещений осуществляется для категории граждан, не состоящих на учете нуждающихся в улучшении жилищных условий.**

**Начало строительства — ноябрь 2012 г.**

**Окончание строительства – I квартал 2014 г.**

**Местонахождение объекта долевого строительства:** Минский район, д. Боровляны, ул. Березовая роща.

**Архитектурно-планировочные решения:**

Здание 107-квартирного жилого дома, в том числе: однокомнатных – 54 ед., двухкомнатных – 32 ед., трехкомнатных – 21 ед., 4-этажное, состоит из 7-ми секций, протяженность здания – 155,72 м. На первом этаже расположены встроенные помещения: магазин непродовольственных товаров, офисные помещения. В подвале под всем зданием размещены офисные помещения, помещение товарищества собственников.

Площадь жилого здания – 10294 м². Во всех квартирах предусмотрены летние помещения (остекленные лоджии).

**Встроенные помещения магазина:** общая площадь – 71,4 м².

**Офисные помещения:** общая площадь – 1632,9 м².

**Помещение товарищества собственников:** изолированное помещение с отдельным входом на первом этаже 3-й секции.

На крыше размещена крышная котельная.

Кровля – плоская рулонная с организационным внутренним водостоком.

Фундаменты дома – столбчатые из монолитного железобетона под отдельно стоящие колонны и монолитные ленточные под стены цоколя.

Железобетонные несущие стены приняты толщиной 200 мм.

Колонны – железобетонные монолитные, квадратного сечения с размерами 400х400 мм и прямоугольного сечения 300х800 мм.

Диски перекрытий – монолитные железобетонные.

Наружные самонесущие стены – из блоков ячеистого бетона толщиной 500 мм.

**Наружная отделка:**

Наружные стены – отделка наружных стен штукатуркой с покраской акриловой краской.

Цоколь – штукатурка с покраской фасадными красками по предварительно подготовленной поверхности.

**Застройщиком получены:**

экспертное заключение Дочернего республиканского унитарного предприятия «Госстройэкспертиза по Минской области» от 05.04.2013 № 495-70/13, дополнение от 11.04.2013 № 10-58;

решение Минского районного исполнительного комитета от 29.10.2012 № 7171 «О разрешении на строительство»;

разрешение Инспекции департамента контроля и надзора за строительством по Минской области на производство строительно-монтажных работ от 29.01.2013 № 1-111Ж-893/12;

свидетельства о государственной регистрации земельных участков от 22.01.2013 г. № 600/991-7463, от 22.01.2012 № 600/991-7462.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков, осуществляющих строительство жилых помещений, после ввода объекта в эксплуатацию: межквартирные лестничные клетки, лестницы, коридоры, за исключением подвала, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Состав общего имущества в многоквартирном жилом доме, которое будет в общей долевой собственности дольщиков, осуществляющих строительство нежилых помещений, после ввода объекта в эксплуатацию: межэтажные лестничные клетки, лестницы, коридоры, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания.

Срок действия настоящей проектной декларации — до момента опубликования новой проектной декларации, которая отменяет действие опубликованных ранее.

**Информацию по объекту долевого строительства и условиям заключения договоров можно получить в уполномоченной риэлтерской организации ОДО «Твоя столицаконсалт», г. Минск, ул. Шафарнянская, 11. Время работы: понедельник – пятница: 9.00–18.00, выходные: суббота, воскресенье, тел./факс: +375 (17) 286 37 27, моб.: +375 (29) 680 01 01, +375 (29) 771 01 01.**



**Канстанцін ПРЫДЫБАЙЛА:**

# «Я мог прыехаць у Беларусь у якасці футбаліста»

**Ён рос на праграмах Уладзіслава Лісцьева і рэпартажах Аркадзя Мамантава. А сёння сам працуе на тэлебачанні. Праўда, раней было захапленне спортам, праца ва ўніверсітэце і на радыё «Мінск». Цяпер жа Канстанцін Прыдыбайла — вядучы ў праектах «Мірны тур» і «Беларусь LIFE», а таксама навін на канале «Беларусь 1». Пра ўласны выбар па жыцці, любоў да Беларусі і нечаканасці ў кадры ён расказаў нашаму карэспандэнту.**

**— Косця, ты родам з Іжэўска — а гэта, трэба сказаць, не блізка. Якім чынам трапіў у Беларусь?**

— Насамрэч я нарадзіўся ў Варкуце, за палярным кругам. Бацька ў мяне вайсковец, а маці ўрач — класічная для савецкіх часоў сям'я. Яны самі родам з Беларусі і выраслі тут. Бацька вучыўся ва ўніверсітэце транспарту ў Гомелі, а потым пайшоў у армію. А там з улікам абставін перамяшчэнне ўжо вызначала начальства. Так мы апынуліся ў Варкуце, потым з часам пераехалі ў Іжэўск, дзе я пражыў да 2006 года.

Я з дзяцінства ведаў, што мы беларусы і маіх бацькоў цягнула вярнуцца на радзіму. Тут уся іх сям'я. Думалі, планы здзейсняцца, калі бацька выйдзе на пенсію, але пакуль яны ўсё яшчэ ў Расіі. Я з 9 класа пачаў задумвацца пра тое, каб паступіць у беларускі ўніверсітэт, але, акрамя БДУ, не ведаў іншых варыянтаў. Паспеў здаць іспыты дома і паехаў у Мінск паступаць. Нават атэстат маці толькі праз месяц прывезла.

**— Як праходзіла адаптацыя?**

— Каб паехаць некуды, такога не было дагэтуль у маім жыцці. Уяві толькі: ты прыязджаеш у горад, дзе быў аднойчы, памятаеш вакзал, плошчу і ўнівермаг «Беларусь». Зразумела, перад ад'ездам вывучаў і глядзеў нешта ў інтэрнэце. Аднак прыехаць і жыць — зусім іншая справа. Першы месяц практычна не выходзіў з кватэры, бо быў заклапочаны паступленнем. Паступіў, паехаў у Іжэўск па рэчы, а вярнуўшыся, пачаў даследаваць ваколіцы. Цяпер карты і маршруты ў кожнага ў смартфоне, а я шукаў патрэбныя адрасы па звычайнай папяровай карце. Памятаю, першыя заняткі былі на вуліцы Курчатава, якая знаходзіцца за кальцавой Мінска, — каб дабрацца, распытваў прадаўшчыцу ў кіёску. За дзень да заняткаў з'ездзіў туды, агледзеўся на мясцовасці. А там ужо пачалася вучоба, з'явіліся знаёмыя, кампанія. Стала лягчэй.

**— Сёння як адчуваеш сябе ў Мінску?**

— Мне здаецца, быццам я ўжо дома. Нават мае сябры пачалі адзначаць, што я цяпер кажу «ў нас у Мінску», а раней такога не было...

**— Да бацькоў цяпер ездзіш у госці?**

— Хутчэй, яны прыязджаюць да мяне некалькі разоў на год. Я там апошні раз быў гады чатыры таму. Раней туды хадзіў амаль прамы цягнік з Мінска і на падарожжа страчваў гадзін 38. Дзве ночы пад стук колаў не заўсёды лёгка даюцца. Хаця я люблю цягнік: новыя знаёмствы, прыгоды... Вось бы самалёт — тады бываў бы дома часцей.

**— А як так атрымалася, што ты выбраў прафесію псіхолага, калі ўлічваць заняткі танцамі і спортам?**

— Бальныя танцы я пакінуў рана. А з футболам была свая гісторыя. Гуляў я добра. Неяк мяне нават запрасілі на прагляд у Мінск у клуб МТЗ-РІПА (з 2010 перайменаваны ў «Партызан» — **Аўт.**). І ўжо ў 2003 годзе я меў магчымасць пераехаць у Беларусь у якасці футбаліста. Я ж вырас у сям'і, дзе спорт быў заўсёды. Бацька з'яўляецца кандыдатам у майстры спорту па вольнай барацьбе. Пры жаданні можна было будаваць кар'еру футбаліста, але мяне не вельмі прываблівала перспектыва абмежаваць жыццё толькі трэніроўкамі, імкненнем да вынікаў. Хацелася нечага большага, таму паралельна з заняткамі спортам я стараўся вучыцца. З часам выбраў псіхалогію. Праўда, была думка паступаць на паліталогію. Веды дапамагаюць мне і сёння, хоць па спецыяльнасці і не працаваў. Псіхалогія наогул важную ролю адыгрывае ў жыцці кожнага.

**— На тэлебачанне ты прыйшоў праз кастынг...**

— Калі я прыйшоў на тэлебачанне, то кастынг быў яшчэ не ў такім маштабе, як ідзе цяпер. Два гады таму мяне запрасілі паспрабаваць сябе ў якасці вядучага праграмы «Добрай раніцы, Беларусь». Раней я скончыў курсы тэлевядучых, працаваў на радыё — так, магчыма, мяне і заўважылі. Запісалі мы нейкія пробы, але я не падышоў, відаць. А праз нейкі час патэлефанавалі з Агенцтва тэлевізійных навін і прапанавалі стаць вядучым навін спорту. Пасля сустрэчы мяне быццам зацвердзілі, толькі параілі спачатку паспрабаваць папрацаваць карэспандэнтам. З'явілася магчымасць зразумець спецыфіку тэлебачання і працы ў кадры. Доўга думаў, ці патрэбны мне спорт, бо дагэтуль пяць гадоў працаваў у сферы культуры і за спартыўнымі падзеямі амаль не сачыў. Я разумеў, што крыху «не ў тэме», аднак вырашыў не страчваць магчымасці і праз некалькі месяцаў добра асвоіўся, а праз паўгода, думаю, быў ужо неблагім спартыўным журналістам.

**— Падчас першага эфіру вельмі хваляваўся?**

— Напярэдадні мы размаўлялі з маім кіраўніком Мікалаем Стулам, і ён сказаў, што першы эфір будзе ў запісе. У вызначальны дзень я прачнуўся з поўнай упэўненасцю, што ўсё будзе так, як запланавалі. А тут тэлефануе кіраўніцтва і паведамляе: выхад у прамым эфіры. Кірыл Казакоў тады матываваў сваё рашэнне так: калі выплыве, то будзе плаваць, а не — значыць, не лёс... На працу я сабраўся значна хутчэй, чым планаваў. Быў адносна спакойны, але ў эфіры рукі ўсё ж дрыжэлі, хоць і працэс ведаў, і рэпетыцыя была не адна.



**— На працы часцей здараюцца прыемныя нечаканасці альбо і панервавацца даводзіцца?**

— Быў у маёй эфірнай практыцы выпадак, калі выключыўся суфлёр. Добра, што мы самі тэксты пішам, таму з сітуацыяй справіўся. Але ў першы раз было страшна. Непрадбачаныя сітуацыі здараюцца часцей на іншых праектах. У «Беларусь LIFE» знаёміліся з крабам Пятровічам, і ён цапаў мяне клюшнямі. Падчас «Мірнага тура» было шмат цікавага. Напрыклад, на рыбалцы Максіма Мірнага на Браслаўскіх азёрах. Дзве гадзіны ён вудзіў рыбу, і аператар вырашыў больш не здымаць, а я папрасіў пачакаць яшчэ пяць хвілін. Уключаецца камера — і тут Макс злавіў рыбіну! Здымае з кручка, кідае на траву, а праз хвіліну бачу, як яго малодшы сын Дзямід бярэ тую рыбіну і адпускае ў возера. Уяві, які кантраст эмоцый! І яны трапілі ў кадр. Так што, сапраўды, нечаканасці бываюць прыемнымі і даюць жыццё ўдалым кадрам.

**— Наогул здымкі «Мірнага тура па Беларусі» былі не з лёгкіх?**

— У тур мы ездзілі мінулым летам. За 7 дзён ахапілі 8 гарадоў. Здымкі ішлі нон-стоп, штодня ад 6 да 12 гадзін. Кожны дзень ты ўстаеш а сёмай раніцы і кладзешся спаць у гадзіну ночы. Плюс да гэтага ноччу праз кожную гадзіну прачынаешся і адсочваеш, як там праходзіць кадзіроўка відэа ў патрэбны фармат. Рэсурс добры здабылі. У канцы былі проста выціснутыя, але вынік таго варты. Беларусь прыгожая і вялікая. На жаль, многія месцы яшчэ не зведаны намі. Ёсць новыя ідэі, і наогул, лічу, праграм пра нашу краіну шмат быць не можа.

**— У тваіх словах адчуваецца любоў і замілаванасць...**

Гэта як у песні: «Каб любіць Беларусь нашу мілую, трэба ў розных краях пабываць». Я ведаю, што і як у Расіі, люблю Украіну і бачу Беларусь. І тут мяне ўсё задавальняе і мне добра. Калі нешта не падабаецца, то спрабую дабіцца змен. Так, напрыклад, каля майго дома ёсць састарэлыя аўтамабілі, якія толькі месца займаюць, — значыць, зраблю ўсё магчымае, каб іх прыбралі. І гэта зробяць, няхай і праз месяц. Мне здаецца, кожны павінен імкнуцца зрабіць лепш, падтрымліваць чысціню. Дробязі многае вырашаюць. Многія імкнуцца здабыць візу і ад'ехаць адсюль, а мне тут цікава і хочацца пабываць там, дзе яшчэ не давялося.

**— Дарэчы, пра Украіну. Існуе меркаванне, што там тэлебачанне выдае больш якасны прадукт. Згодны?**

— Украінскае тэлебачанне проста іншае. Месцамі лепшае, а ў нечым нам саступае. Напрыклад, мы мацнейшыя ў інфармацыйным і аналітычным плане, а яны ў публіцыстыцы і забаўляльным фармаце. Я працую ў навінах, і наша галоўная мэта — даваць аўдыторыі глебу для разваг. Цяпер АТН перайшло на фармат, дзе адсутнічае канкрэтыка: чорнае ці белае, правільна альбо не. Мы расказваем, што і як, не вызначаючы, добра тое ці дрэнна, а глядач няхай робіць сам высновы. Гэта новы ўзровень, на які выйшла наша тэлебачанне.

**— У якасці гледача якім праграмам і каналам аддаеш перавагу?**

— Інтэрнэт сёння пераважае, там можна знайсці амаль усё. Я гляджу нашы каналы. Мне падабаецца праграма выхаднога дня на «Беларусь 1». Калі ў панядзелак выпадае вольны ад працы дзень, то ўключаю «Маю планету». Для мяне гэты канал нават у нечым лепшы за «Discovery». Шмат гляджу розных замежных вячэрніх шоу. Як «Паміж дзвюма папарацямі» Зака Галіфіянакіса. Яго варта глядзець.

**Алена ДРАПКО.**

■ Неасабісты суб'ектыў

# ПРАЎНУКІ АДАМА



## Успамінаючы сваіх памерлых, мы знаходзім саміх сябе

Чым даўжэй жывеш на свеце — тым больш становіцца родных і дарагіх магіл. І вось ужо на Радаўніцу не ведаеш, куды перш ехаць — ці ў Кукшавічы, ці ў Волму, ці на Яшэўшчыну. Неяк, з Божай дапамогай, да вечара паспяваем. Бо ўсіх жа трэба пабудзіць, пахрыстосавацца, расказаць, што новага за зіму адбылося. Я вось часта думаю: чаму Радаўніца ў народнай культуры пазначана менавіта як свята? Нагода насамрэч невясёлая, едзем жа на сустрэчу з нябожчыкамі, і яшчэ нярэдка стрэмкай у сэрцы сядзіць боль нядаўняй страты, і халодныя слёзы наварочваюцца на вочы — ці то ад нахабнага веснавога ветру, ці то ад успамінаў і гэтага балючага ўсведамлення «ніколі больш»...

І ўсё ж — свята. Гэта пачынаеш разумець кожны раз наноў, калі, прыехаўшы ў Кукшавічы першым, парадкуючы ў аградах, раз-пораз падымаеш галаву, пачуўшы, як ляпнулі дзверы машыны. Ці наадварот, крыху прыпазніўшыся, ідзеш да знаёмых помнікаў, пільна ўглядаючыся, хто там дзе завіхаецца. Цётка Валя ўжо прыехала, а цёткі Светы з сям'ёй пакуль не відаць. Павел ужо прыбіраецца ў аградзе ў прабабулі з прапрабабуляй, а Света малодшая, яго сястра, у сваіх бацькоў — цёткі Люды з дзядзькам Віцем... Абдымкі, пацалункі, слёзы радасці — сустракацца звычайна ўдаецца раз на год, вось тут, на могілках (калі няма якой радаснай ці, не дай Бог, сумнай нагоды). Свята сустрэчы вялікай радні, у якой шмат асобных сем'яў, але якія мацуюцца на адных каранях.

Менавіта тут, на могілках, ты адчуваеш, як гэтыя карані надзейна — надзейней, чым дом, пасада, стасункі з патрэбнымі людзьмі — трымаюць цябе на гэтай зямлі. Бо вось, здаецца, амаль чужыя людзі, і ступень сваяцтва — чацвёртае калена (а ў нашых дзяцей ужо і пятае!), і бачымся зусім нячаста, але ў старой, гадах у 50-х выкаванай надзейнай аградзе ляжыць жанчына Серафіма, а побач — яе муж Кірыла, і ўсім нам — стрыечным, «траюрадным», «чацвераюрадным» гэтыя людзі аднолькава родныя — яны ўсім нам прадзед і прабабуля, а нашым маці ці бацьку — бабка ды дзед, а нашым дзецям — прапра... А значыць і мы ўсе — аднаго роду, мы, калі трэба — адно за аднаго сцяной, мы не ўпадзём нават ад моцнага ветру, бо вунь колькі моцных плячэй, спагадлівых вачэй побач, бо нашы агульныя магілы нам і абарона, і суцяшэнне. Гэтае веданне, як і разуменне Радзімы, калі яно з'яўляецца ўпершыню, аднойчы і назаўсёды робіць нас дужэйшымі і больш упэўненымі. Ты свой на сваёй зямлі. Тут твае карані. Тут твой род — і тыя, хто ўжо ў іншым свеце, і тыя, хто побач кожны дзень, і тыя, хто далёка, але хто абавязкова прыляціць на дапамогу, калі здарыцца няшчасце. Радаўніца — наша сапраўднае свята, бо за гэтае ўрачыстае адчуванне, ад якога нібы вырастаюць крылы і жыць на зямлі становіцца трывалей і смялей, многія народы, чые качавыя магілы раскіданы па вялізных абсягах, шмат аддалі б. Гэтае адчуванне, гэтая ўпэўненасць — нібы найвялікшая падзяка нам нябёсаў за тое, што нам заўсёды ставала сваёй зямлі, мы ніколі не хадзілі заваёўваць іншых, не перамяшчаліся цэлым народам па абсягах Еўразіі ці нават за акіян у пошуках лепшай долі.

А на Яшэўшчыне — там ужо бацькава радня ляжыць — мы з сястрой гадоў дзесяць таму на Радаўніцу адшукалі магілу прадзеда. Так здарылася, што дагэтуль не ведалі толкам, дзе яна: бабуля ў апошнія дзесяць гадоў свайго жыцця, пахаваўшы на іншых могілках пяцідзесяцігадовага сына, пры любой нагодзе імкнулася да яго. Яна занадта доўга жыла — пэўна, і за сына, і за мужа, якога расстралялі ў трыццаць сёмым, — каб згадваць часта магілу бацькі, які памёр яшчэ да вайны... Мы хадзілі па старой частцы могілак, углядаліся ў замшэлыя помнікі, чыталі надпісы, выбітыя дзе па-руску, дзе па-беларуску, дзе па-польску. І раптам — «Рэдзька Адам Іванавіч. Нарадзіўся ў 1874-м, памёр у 1936-м». Гэта было адкрыццё. Столькі думак раптам у галаве замітусілася. І пра тое, што ў 36-м нашай бабцы было трыццаць гадоў, а праз год пасля смерці бацькі ў яе забралі мужа. І пра тое, што трэба абавязкова звярнуцца ў архіў і пацікавіцца пра Рэдзьку Івана — прапрадзеда, які памёр у канцы XIX стагоддзя. І пра тое, што, па каліву збіраючы гісторыю сваёй сям'і, мы ўплятаем яе ў гісторыю сваёй Радзімы, і пакуты, радасць, слёзы і набыткі тваіх родных людзей — гэта частка лёсу зямлі, на якой яны нарадзіліся і пражылі свой доўгі або не вельмі век...

Вы асабліва пра гэта не задумваліся? Едучы сёлета да родных магіл, паспрабуйце. Вазьміце з сабой дзяцей, раскажыце ім пра прадзеда, які паранены вярнуўся з вайны, пра дзедаву сястру, якая падарвала здароўе, вырошчваючы кок-сагыз, пра бабуліну маці, якая лячыла травамі і ўмела загаворваць пярэпалахі — у кожнай сям'і, у кожнай роднай магілы ёсць свая гісторыя. Абавязкова раскажыце. Або паспяшайцеся пацікавіцца самі ў старэйшых, каб запомніць і расказаць пасля, калі прыйдзе ваша чарга весці хроніку роду.

Свая ноша — не цяжкая. А пры выпадку — як знойдзеце.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ**

■ Медыяпрастора

# «НАША СТАЛІЦА»

| | | | |
|---|---|---|---|
| **Брэст** | **106.6 FM** | | |
| **Віцебск** | **101.8 FM** | **Бабруйск** | **103.6 FM** |
| **Мінск** | **107.1 FM** | **Баранавічы** | **98.4 FM** |
| **Гродна** | **104.2 FM** | **Салігорск** | **104.3 FM** |
| **Магілёў** | **107.8 FM** | **Пінск** | **103.2 FM** |

**Гарадоў можа быць шмат, але сталіца заўсёды адна. Усё пра мінчан і жыццё Мінска кожную нядзелю распавядае вядучая радыё «Мір» Кацярына Карпека.**

Падборка самых цікавых і значных сталічных навін: ад эканамічнага жыцця і культурных падзей да вясёлых здарэнняў і кур'ёзаў. Вы пачуеце адказы на пытанні, якія хвалююць кожнага: ці падаражэе зноў праезд, чаму мінскія паркоўкі стануць платнымі і дзе можна адпачыць у маі? Таксама традыцыйна — прагнозы ад сіноптыкаў на наступны тыдзень.

Калі вы хочаце трымаць руку на «пульсе жыцця» і даведацца больш аб нашым выдатным горадзе — настройвайцеся на «мірную» хвалю кожную нядзелю ў 11.30.

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 28 КРАСАВІКА

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.10** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.50** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05** Клуб рэдактараў.
**10.50** «Мая праўда». «Мікеле Плачыда. Тайна камісара Катані».
**11.55, 15.25, 18.35** Eurovision. Без каментарыяў.
**12.10, 0.40** Дак. серыял «Містычныя гісторыі».
**13.05 Серыял «Двайное жыццё».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.30 Серыял «След».**
**16.30** «Сямейныя меладрамы».
**17.30** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**19.55** Форум.
**21.00** Панарама.
**21.45 Меладрама «Маскоўскія прыцемкі». 1-я і 2-я серыі.**
**23.40** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.25** Дзень спорту.

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.00, 21.20** Тэлебарометр.
**9.05, 17.55 Серыял «Двое з куфра 2».**
**10.35 Камедыя «Маленькі гігант вялікага сексу».**
**12.15 Серыял «Ластаўчына гняздо».**
**14.15** «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
**14.50 Баявік «Скарб Амазонкі».**
**16.50, 23.35** Ток-шоу «Перазагрузка».
**17.35** «Кіпень».
**18.55 Серыял «Разумнік».**
**20.45** Дак. серыял «Азбука добрага самаадчування».
**21.25** КЕНО.
**21.30 Серыял «Універ. Новы інтэрнат».**
**22.40 Серыял «Рэальныя хлопцы».**
**0.20** Музычны конкурс «GBOB» у Беларусі.

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.20, 15.00, 17.05, 21.05, 0.10** «Калейдаскоп».
**8.10, 12.25, 15.05, 17.15, 0.20** «Сімвалы эпохі». Духі «Красная Масква».
**8.20** Дзіцячы фільм. «Чэснае чарадзейнае».
**9.30, 21.55** «Дыя@блог». «Пра мову».
**10.00, 21.15 Серыял «Мегрэ».**
**10.50, 23.45** «Святло далёкай зоркі». Памяці кінарэжысёра Барыса Сцяпанава.
**11.15, 14.35, 15.50, 19.15** «Размаўляем па-беларуску».
**11.20** «Споведзь». Творчы вечар народнага артыста Расіі Мікалая Бурляева.
**12.40 «Ваенна-палявы раман». Маст. фільм.**
**14.10** «Струны прасторы і часу». Дак. фільм пра генеральнага дырэктара Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі Уладзіміра Пракапцова.
**14.40** М/ф.
**15.20** «Падарожжа са смакам».
**15.55** «Музеум». Урэцка-Налібоцкае шкло.
**16.10** «Знакі лёсу. Віктар Казько». Дак. фільм.
**16.40** «Тэатральны ліцэй».
**17.25 «Я помню». Маст. фільм.**
**18.50** «Скарбніца Віцебшчыны». Маёнтак роду Лапацінскіх.
**19.20** «На прыродзе з Віталем Гуменным». Выганашчанскія балоты.
**19.35 «Доўгі шлях у лабірынце». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**20.45** Калыханка.
**22.20 «Трактарысты». Маст. фільм.**

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Сандэрлэнд» — «Кардзіф».
**10.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Ліверпуль» — «Чэлсі».
**11.50, 16.25** Валейбол. Чэмпіянат Беларусі. Фінальная серыя.
**13.55** Тэніс. Турнір ВТА. Штутгарт. Фінал.
**15.55** Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Відэачасопіс.
**18.30** Футбол. На шляху да чэмпіянату свету-2014. Відэачасопіс.
**19.00** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**19.55** Хакей. КХЛ. Фінал. «Леў» — «Металург».
**22.05** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Прэм'ер-ліга. «Арсенал» — «Ньюкасл».
**0.05** Час футбола.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00,16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.05** «Жыць здорава!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10** «У наш час».
**12.05** «Яны і мы».
**13.10** «Справа ваша...».
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Востраў Крым».
**16.55** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік». «Ваеннапалонныя. Вінаватыя, калі выжылі».
**19.00** «Чакай мяне».
**20.00** Час.
**21.05** Ток-шоу «Пазіцыя».
**22.05 Меладрама «Як Джэк сустрэў Джыл».**
**23.45 Камедыя «Уся праўда пра мужчын».**
**1.35** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Міншчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою.
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт.
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Вялікае снеданне».
**10.40** «Дзіўная справа».
**11.40** «Такі лёс».
**12.30** «Чатыры вяселлі».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** «Зорны рынг. Новы сезон. Бітва кавер-бэндаў».
**15.30** «Не хлусі мне!».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**17.30** «Ежа багоў».
**18.30** «Мае выдатныя...».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці» .
**20.15 Маст. фільм «Пасейдон».**
**22.00** Рэпарцёрскія гісторыі.
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін».
**7.15** Беларусь сёння.
**8.15 Серыял «Сёстры».**
**10.00 Маст. фільм «У старых рытмах».**
**11.30** «Наша марка».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны Садружнасці (бягучы радок).
**12.20 Серыял «Чужыя памылкі».**
**14.05, 4.05 Серыял «Таемныя знакі».**
**15.20, 23.30** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.10, 2.15 Серыял «Монтэкрыста».**
**18.20 Серыял «Дзеці Арбата».**
**21.20 Серыял «Вакзал».**
**23.00** Беларусь сёння.
**0.20** «Агульны інтарэс».
**0.45 Маст. фільм «Трактарысты».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.00** «Карціна свету».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.45** «Асаблівы выпадак».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.30** Навіны — Беларусь.
**14.30** «Шыфры нашага цела. Смех і слёзы».
**15.35** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.45 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял « Скліфасоўскі-3».**
**23.40** «Свет людзей, якія не выспаліся».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.40** «Новыя рускія сенсацыі».
**9.40, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.00** «Да суда».
**11.55, 13.25** «Суд прысяжных».
**14.25** «Справа ўрачоў».
**15.10** «Гатуем з Аляксеем Зіміным».
**15.40, 18.35** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**16.25** «Пракурорская праверка».
**17.35** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**19.35 Серыял «Чужы раён».**
**21.15 Маст. фільм «Чорны горад».**
**23.00** Сёння. Вынікі.
**23.25 Серыял «Інспектар Купер».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 13.30, 19.05, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05** М/ф.
**8.25 Серыял «Светлячок».**
**9.55, 17.55 Серыял «Сапраўдны дэтэктыў».**
**11.00 Драма «Прыслуга».**
**13.35 Серыял «У чым віна Фатмагуль».**
**15.10 Дэтэктыў «Айцец Браўн».**
**16.00** Мультпарад.
**16.30** «Мой любімы гадаванец».
**17.00 Серыял «Вікінгі».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Драма «Адплата».**
**23.05 Серыял «Каварныя пакаёўкі».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** «PLAY».
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.30** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00, 19.00 Серыял «Маладзёжка».**
**13.00, 23.20** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Нанакаханне».**
**16.00 Трылер «Тры дні на ўцёкі».**
**18.40, 0.00** «Лаві момант».
**21.10 Камедыя «Фанфан-цюльпан».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.15** Навіны культуры.
**9.15, 0.40** «Наглядальнік».
**10.15 Серыял «Пэры Мэйсан».**
**11.10, 19.10** «Правілы жыцця».
**11.40** «Лінія жыцця». Ірына Вінер.
**12.35 Маст. фільм «Звальненне на бераг».**
**14.10** Фільм-спектакль «Лебядзіная песня».
**15.35** Канцэрт Акадэмічнага сімфанічнага аркестра Санкт-Пецярбургскай філармоніі імя Д.Д. Шастаковіча.
**17.10** Academia.
**18.15** Галоўная роля.
**18.30** Дак. фільм «Гіпербалоід інжынера Шухава».
**19.40** «Кінескоп». «Кен Лоўч і яго кіно».
**20.20** «Тым часам».
**21.05** Дак. фільм «Адлюстраваны час. Меню 1945 года».
**21.30** 90 гадоў Данатасу Баніёнісу. «Астравы».
**22.35 Маст. фільм «Ніхто не хацеў паміраць».**
**0.20** І. Штраус. Не толькі вальсы.
**1.40** М. Мусаргскі. Фантазія «Ноч на Лысай гары».

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Быў час»: «ГКЧП». 2004 год.
**5.55** «Песня года». 1972 год.
**7.20** « Вакол смеху». 1984 год. 1-я частка.
**8.05** «Марат, Ліка і Леанідзік». Спектакль Маскоўскага тэатра «Ленкам». 1971 год.
**9.55** «Блакітны агеньчык». Першамайскі выпуск. 1982 год.
**11.00** «Галасы сяброў». 1978 год.
**12.00, 21.00, 3.00** «Народжаныя ў СССР».
**13.00** «КВЗ». ДДУ-ДПІ. 1990 год.
**14.00** «Слова Андронікава». 1974 год.
**15.00** «Я люблю цябе, жыццё!». Фільм-канцэрт.
**16.00** «Пакуль усе дома». 1993 год.
**16.35, 19.40** Канцэрт замежнай эстрады.
**17.00** «Ранічкаю». 1993 год.
**17.35** «На біс». Кінаканцэрт.
**18.30 «Джамайка». Маст. фільм. 1-я серыя.**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**22.00** «Прагpама А». 1989 год.
**23.00** «Бачу цэль!». Дак. фільм.
**23.30** «Ранішняя пошта». 1991 год.
**0.05** «Нью-Ёрк, Нью-Ёрк». 1995 год.
**0.45 «Ён, яна і дзеці». Маст. фільм.**
**4.00** «Кінапанарама». 1991 год. 2-я частка.

### EUROSPORT

**9.30** Аўта- і мотаспорт.
**9.45** Супербайк. Чэмпіянат свету.
**10.30, 15.00, 19.30** Снукер. Чэмпіянат свету.
**12.00** Веласпорт. Льеж—Бастонь—Льеж.
**13.30** Веласпорт. Нацыянальны тур.
**18.00** All Sports.
**18.30, 0.15** Футбол. Еўрагалы.
**19.15** Тэлечасопіс WATTS.
**0.00** Конны спорт. Скачкі.
**1.00** Футзала. Кубак УЕФА. Фінал.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 10.55, 17.00, 19.00, 2.05** Скетчком «Паміж намі».
**5.15, 8.00, 12.55, 16.00, 21.00, 2.20** Серыял «Як не варта жыць».
**6.15** Камедыя «Нянькі».
**7.45, 10.40, 18.45, 20.45, 23.50, 1.50** «Камедыянты. Лепшае».
**9.00** Камедыя «Вясельны пярэпалах».
**11.15** Камедыя «Лысы нянька: Спецзаданне».
**14.10** Камедыя «Жаніх вяртаецца».
**17.20** Камедыя «Мужчына з гарантыяй».
**19.20** Камедыя «Закаханы да непрытомнасці».
**22.10** Камедыя «Выкрутасы».
**0.10** Камедыя «Няма чаго дэклараваць».
**3.25** Мюзікл «Другі хор».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.20** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**9.00, 18.30, 3.10** Серыял «Забароненае каханне».
**10.15** «Паненка і кулінар».
**10.45, 17.00** Дак. серыял «Паралельны свет».
**11.45, 16.00** Дак. серыял «Варажбітка».
**12.45, 18.00** Дак. серыял «Паляўнічыя на прывідаў».
**13.15** «Жонка. Гісторыя кахання». Аксана Ярмольнік.
**14.30** «Сто пытанняў даросламу». Яўген Дога.
**15.15, 0.10, 5.15** Серыял «Звышнатуральнае».
**20.15** Серыял «Шапавалаў».
**21.15, 4.35** Серыял «Жыццё і лёс».
**22.00** Маст. фільм «Планета Ка-Пэкс».
**0.55** Серыял «Хадзячыя мерцвякі».
**1.40** «Часова даступны». Ала Дзямідава.
**2.30** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Дрэва».
**6.50** Драма «Што хавае хлусня».
**8.30** Камедыя «СМСуальнасць».
**10.05** Драма «Касмаполіс».
**11.55** Камедыя «Вампіркі».
**13.40** Камедыя «Ходзяць чуткі...».
**15.30** Камедыя «Спачатку каханне, потым вяселле».
**17.10** Драма «Сакавіцкія іды».
**19.00** Камедыя «Поўнач у Парыжы».
**20.45** Драма «Сумны Валянцін».
**22.50** Трагікамедыя «Геніяльны тата».
**0.30** Камедыя «Алекс і Эма».
**2.15** Драма «Буш».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**6.00** Прыгоды «Два капітаны».
**8.00** Меладрама «Мамы».
**10.00** Камедыя «Самы лепшы фільм 3-ДЭ».
**11.50** Трагікамедыя «Тэатр».
**14.20** М/ф «Тры волаты і Шамаханская царыца».
**15.50** Драма «Дзяўчына і смерць».
**18.00** Драма «Гагарын: першы ў космасе».
**20.00** Драма «Матч».
**22.10** Меладрама «Восеньскія клопаты».
**23.50** Прыгоды «Ліса Аліса».
**1.30** Трагікамедыя «Неадэкватныя людзі».
**3.30** Трагікамедыя «Нябесныя ластаўкі».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Найцяжэйшы ў свеце рамонт.
**6.00, 16.00** Рыбы-пачвары.
**7.00** Напад каётаў.
**8.00, 13.00, 18.00, 21.00, 0.00, 3.00** Космас.
**10.00** Прыроджаны байкер.
**12.00** Золата Юкана.
**15.00** Дзікая прырода Амерыкі.
**17.00, 2.00** Верталётныя баталіі.
**20.00, 1.00, 4.00** Навука будучыні.
**23.00** Жах у нябёсах.

### DISCOVERY

**7.00** Амерыканскі чопер.
**7.50, 12.20, 22.00** Выжыванне без купюр.
**8.40, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35** Што ў вас у гаражы?
**10.30, 0.00** Top Gear.
**11.25** Не спрабуйце паўтарыць.
**13.15, 16.25, 6.05** Махінатары.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05** Беар Грылс: выбрацца жывым.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**18.15** Неверагодны хмарачос.
**19.10** Навука магіі.
**21.00** Рэальныя дальнабойшчыкі.
**23.00** Голыя і напалоханыя.
**0.55** Беар над Эверэстам.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Вокамгненныя катастрофы.
**5.10** Будучыня.

■ Як дома!

# ЦІ КОЖНАЯ ГАСЦІНІЦА МОЖА АТРЫМАЦЬ «ЗОРКУ»?

## У любым выпадку ручнікі і бялізну мяняць павінны

**Да чэмпіянату свету па хакеі ў Мінску засталося два тыдні. Беларуская сталіца перажывае самы сапраўдны «гасцінічны бум»: ледзь не кожны тыдзень адкрываюцца па дзве-тры гасцініцы. І практычна ўсе яны жадаюць «запаліць зоркі» на сваіх новых фасадах. У самы раз даведацца, якія патрабаванні прад'яўляюцца сёння ў рэспубліцы да гасцініц. Чым адрозніваюцца атэлі ў дзве і пяць «зорак»? Што такое хостэлы і на які ўзровень сэрвісу можна разлічваць, спыняючыся ў іх? Каб усё гэта высветліць, карэспандэнт «Звязды» адправілася ў Беларускі дзяржаўны інстытут стандартызацыі і сертыфікацыі ( БелДІСС). Тут на працягу амаль 15 гадоў працуе орган па сертыфікацыі паслуг гасцініц, а два гады таму адкрыўся рэспубліканскі арганізацыйна-метадычны цэнтр у гэтай сферы.**

### Працаваць на якасць — залог поспеху

**Начальнік аддзела сертыфікацыі паслуг БелДІСС Тацціяна СМІРНОВА** адзначыла, што сертыфікацыя з'яўляецца важным інструментам для тых гасцініц, якія плануюцца да класіфікацыі па катэгорыях — ад 1 да 5 «зорак». У нашай рэспубліцы абавязковая сертыфікацыя паслуг пражывання гасцініц і матэляў, заяўленых да ацэнкі па катэгорыях, уведзена з 2007 года. Гэта азначае, што калі тая ці іншая гасцініца жадае атрымаць катэгорыю, то яна павінна звярнуцца ў орган па сертыфікацыі гэтых паслуг, прайсці працэдуры, вызначаныя ў тэхнічным кодэксе ўсталяванай практыкі 5.3.02-2012 «Нацыянальная сістэма пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь. Сертыфікацыя паслуг гасцініц», і пры станоўчых выніках атрымаць сертыфікат, які пацвярджае адпаведнасць патрабаванням, устаноўленым да заяўленай катэгорыі. Тыя гасцініцы, якія не плануюць класіфікавацца, могуць працаваць без сертыфіката адпаведнасці, але, зразумела, выконваючы дзеючае ў гэтай сферы заканадаўства Рэспублікі Беларусь.

Сертыфікацыя паслуг гасцініц праводзіцца ў тры этапы: ацэнка выканання патрабаванняў бяспекі (санітарна-гігіенічныя, супрацьпажарныя, экалагічныя нормы і правілы, забеспячэнне захаванасці маёмасці пастаяльцаў і інш.), адпаведнасць гасцініцы заяўленай катэгорыі, а таксама бальная адзнака аснашчэння нумароў, мэблі, стану будынка і памяшканняў гасцініцы.

Сертыфікат гатэлю выдаюць на пяць гадоў. Перыядычна аўдытары органа па сертыфікацыі праводзяць яго інспекцыйны кантроль для пацвярджэння выканання ўстаноўленых патрабаванняў і падтрымання адпаведнай якасці паслуг.

Такім чынам, сертыфікацыя паслуг — гэта эфектыўны механізм кіравання якасцю гасцінічных паслуг, які дазваляе аб'ектыўна ацаніць узровень гасцініцы, пацвердзіць адпаведнасць устаноўленым патрабаванням і ў далейшым ажыццяўляць кантроль з мэтай недапушчэння зніжэння дасягнутага ўзроўню прапанаваных паслуг, а таксама стымуляваць пастаяннае павышэнне якасці сэрвісу.



Дарэчы, у краіне прайшлі сертыфікацыю і класіфікацыю па «зорках» 50 гасцініц, у тым ліку тыя, якія ўваходзяць у гасцінічныя комплексы.

### Не ўсе «зоркі» аднолькавыя

Большасць новых гасцініц, якія будуюцца ў нашай краіне, ужо ўлічвае сучасныя патрабаванні: у іх (нават без катэгорыі) ужо няма нумароў без санвузлоў і тэлевізараў, павялічаны плошчы аднапакаёвых двухмесных нумароў.

Гасцініцы катэгорыі чатыры-пяць «зорак» абсталююцца аўтаматызаванымі сістэмамі кіравання (АСК) усёй гасцініцай або гасцінічным комплексам. Яны ўключаюць аўтаматызаваную гасцінічную сістэму, якая ажыццяўляе збор і апрацоўку інфармацыі, вядзенне баз звестак кліентаў, інтэрнэт-браніраванне, абмен інфармацыяй паміж службамі, кіраванне разлікова-касавымі падсістэмамі і інш.; сістэмы кантролю і кіравання доступам у гасцініцу, кіравання комплексам кліматычных сістэм, кантролю за інжынерным абсталяваннем, сістэму відэаназірання, інтэрактыўную тэлевізійную сістэму і інш. Упершыню такімі АСК былі абсталяваны гасцініцы «Вікторыя» КУП «Бізнес-цэнтр «Сталіца», «Атэль «Еўропа» дзяржаўнага прадпрыемства «Атэль «Еўропа».

У «трохзоркавых» гасцініцах пастаяльцы маюць магчымасць атрымаць шырокі набор паслуг. Як правіла, у іх — толькі індывідуальныя нумары, ёсць кавярня або бар, бізнес-цэнтр. У некаторых такіх новых гасцініцах нумары павышанай камфортнасці цалкам або часткова абсталяваны кандыцыянерамі («Гарні» ААТ «Мінатэль», «Турыст» ААТ «Атэль «Турыст», «Проня» УКПП «Камунальнік», «Нарач» ГПУ «НП Нарачанскі» і інш.), а для бяспекі пражывання выкарыстоўваюцца сістэмы відэаназірання.

Асноўныя патрабаванні да гасцінічных паслуг на міжнародным узроўні вызначае Сусветная турысцкая арганізацыя. Ёю былі распрацаваны агульныя рэкамендацыі па класіфікацыі гасцініц ад 1 да 5 «зорак» і матэляў ад 1 да 4 «зорак». На аснове гэтых рэкамендацый быў распрацаваны і дзейнічае міждзяржаўны стандарт ДАСТ 28681.4-95. «Турысцка-экскурсійнае абслугоўванне. Класіфікацыя гасцініц». Адпаведна, гасцініцы краіны, якія жадаюць атрымаць катэгорыю, павінны прайсці сертыфікацыю сваіх паслуг у Нацыянальнай сістэме пацвярджэння адпаведнасці Рэспублікі Беларусь.

«Аднак старыя гасцініцы, асабліва ў невялікіх гарадах, не могуць, а часам і не жадаюць выканаць нават мінімальныя патрабаванні не толькі ДАСТ 28681.4-95, але і СТБ 1353-2005 «Сродкі размяшчэння. Агульныя патрабаванні», устаноўленыя да гасцініц без катэгорыі. Іх у рэспубліцы яшчэ вельмі шмат (каля 60%). У асноўным гэта ведамасныя гасцініцы розных арганізацый, у якіх спыняюцца не турысты, а асобы, якія знаходзяцца ў камандзіроўцы», — дадала Тацціяна Смірнова.

Падчас падрыхтоўкі да чэмпіянату свету па хакеі БелДІСС праводзяцца работы па сертыфікацыі і класіфікацыі ўведзеных у эксплуатацыю гасцініц. Гаворка ідзе пра 14 гасцініц розных катэгорый. Як адзначыла Тацціяна Смірнова, з многімі з іх праца была распачата яшчэ на стадыі праектавання, каб адначасова з адкрыццём выходзіць і на атрыманне сертыфіката.

### Маладзёжная гасцініца

Што ж тычыцца хостэлаў, якія атрымліваюць у апошні час інтэнсіўнае развіццё, то ў СТБ 1353-2005 «Сродкі размяшчэння. Агульныя патрабаванні» выразна акрэслены ўсе мінімальныя патрабаванні да іх. Хостэл — гэта маладзёжная гасцініца, якая прадастаўляе паслугі размяшчэння ў шматпакаёвых нумарах, паслугі харчавання з абмежаваным выбарам страў і (або) магчымасць самастойнага прыгатавання ежы на неабходным для гэтага абсталяванні, а таксама дадатковыя паслугі, уключаючы забаўляльныя, адукацыйныя мерапрыемствы. Гэта і мінімальная колькасць санвузлоў і душавых пакояў, а таксама патрабаванні да асвятлення, водазабеспячэння, вентыляцыі і абсталявання ўсяго хостэла. Устаноўлены патрабаванні да пераліку паслуг, якія аказваюцца, напрыклад, штодзённае прыбіранне нумароў пакаёўкай. Змена пасцельнай бялізны ці прадастаўленне зменнага камплекту пасцельнай бялізны павінны праводзіцца не менш як адзін раз на тыдзень, змена ручнікоў — не менш за адзін раз на тры дні і г.д.

Зразумела, што не варта праводзіць паралелі паміж хостэлам і «пяцізоркавым» атэлем, таму што гасцініца такога тыпу (хостэл) па вызначэнні не можа быць раскошнай, але, безумоўна, мінімальныя патрабаванні павінны быць выкананы. І многія хостэлы ў нашай рэспубліцы, калі яны арганізаваны ў адасобленым будынку, усё гэта выконваюць.

### Фірменны стыль

Сёння вядучыя пазіцыі ў сусветнай гасцінічнай індустрыі займаюць гасцінічныя сеткі. Як правіла, яны нацэлены на прасоўванне высокіх стандартаў абслугоўвання. «Гасцінічная сетка прадугледжвае аб'яднанне некалькіх гасцінічных прадпрыемстваў у калектыўны бізнес, які праводзіцца пад адзіным кіраўніцтвам, у рамках адзінай канцэпцыі прасоўвання прадукту і пад агульнай гандлёвай маркай. У патрабаваннях да кожнай маркі ўлічваецца не толькі ўзровень камфорту, але і прызначэнне, месцазнаходжанне і некаторыя іншыя крытэрыі. Кожная сетка імкнецца фарміраваць пэўны імідж — вядомы тым кліентам, на якога арыентавана гэтая катэгорыя атэля», — патлумачыла Тацціяна Смірнова.

Сёння найбольш вядомыя ў свеце сеткавыя атэлі «Holiday Inn», «Radisson Hotels», «Kempinski Hotels», «Crowne Plaza», «Hyatt International» і інш. У сталіцы пабудаваны і аказвае паслугі сеткавы атэль катэгорыі пяць «зорак» «Crowne Plaza Minsk», будуюцца таксама сеткавыя атэлі «Hyatt» і «Kempinski».

Усе яны без выключэння штогод правяраюцца прадстаўнікамі сеткі, і пры незахаванні стандартаў і патрабаванняў ліцэнзія на права выкарыстання гандлёвай маркі адклікаецца па ўмовах дагавора, а гасцініца выбывае з яе складу.

Бясспрэчна, для таго, каб стварыць адзіную і эфектыўную сістэму ў кожнай сетцы, трэба будзе правесці немалы фронт работ, уключаючы распрацоўку стандартаў абслугоўвання, навучанне персаналу, стварэнне фірменнага стылю, які забяспечвае пазнавальнасць гэтай сеткі. Што апраўдана, паколькі дазваляе ўзняцца на зусім новы ўзровень развіцця. І беларускія атэлі бяруць гэты фактар на заметку.

**Дар'я ШОЦІК,**
**студэнтка 4-га курса**
**Інстытута журналістыкі БДУ.**
**Фота прадастаўлена прэс-службай Дзяржстандарта.**

■ У пошуках кампрамісу

# НАЙШЛА КАСА НА КАМЕНЬ...

## Як у вёсцы Вялікая Быхаўшчына газ праводзілі

**У нумары за 13 снежня мінулага года быў надрукаваны артыкул «Труба Пандоры, або Як газіфікацыя адной вёскі прывяла да нечаканага вострага канфлікту». Газета паабяцала сачыць за тым, як будуць разгортвацца падзеі далей, і сёння мы зноў звяртаемся да гэтай тэмы, бо канфлікт так і не ўладжаны канчаткова.**

### Вяскоўцы аднесліся да сітуацыі з разуменнем, за выключэннем аднаго чалавека...

Нагадаем, што пры газіфікацыі вёскі Вялікая Быхаўшчына Нясвіжскага раёна ў адладжаную схему працы «ўварваліся» некаторыя нечаканыя фактары. На першы погляд, да такога фактару можна аднесці асаблівасці планіроўкі вясковай вуліцы. Але гэта толькі на першы погляд. Насамрэч усё складаней. Толькі давайце спачатку пагаворым усё ж такі пра планіроўку.

Як расказваюць спецыялісты, пры правядзенні газіфікацыі ў гэтай вёсцы ў дагаворы было ўказана, што для таго, каб зрабіць кошт работ таннейшым, земляныя работы ад кропкі ўрэзкі газапровода да хаты выконваюць самі члены газавага кааператыва.

Вяскоўцы паставіліся да сітуацыі з разуменнем, за выключэннем аднаго чалавека — Вольгі Шыбіцкай. Справа ў тым, што ў кожнага гаспадара хаты аказаліся розныя затраты. І Вольга Шыбіцкая са сваімі не пагадзілася.

